онным процессом первокурсников к условиям жизнедеятельности в вузе и к конструируемой профессиональной реальности. Теоретической основой педагогики адаптационных кризисов выступает теория упреждающей адаптации к педагогической деятельности (УА). Как самостоятельное направление УА имеет несколько характеристик: а) стратегия, носителями которой являются преподаватели вуза, обеспечивающие профилактику глубоких и продолжительных адаптационных кризисов и контроль над адаптацией первокурсников к условиям обучения в вузе и конструируемой профессиональной реальности; б) процесс приспособления студентов, характеризующийся созданием для них соответствующих условий; в) способ преобразования личности субъектов адаптации посредством «планирования» для них кризисов [4]: использование в условиях экспериментального обучения специально разработанных адаптирующих средств, провоцирующих возникновение у будущих специалистов кризисов учебно-профессионального развития (**при контроле их протекания!**); г) результат управления преподавателями адаптационным процессом, связанный с критериями упреждающей адаптации; д) цель, к которой стремятся субъекты, реализующие эту стратегию, – смягчение отрицательных проявлений адаптационных кризисов у студентов первого года обучения.

*Литература*


1. Зеер Э. Ф. Психология профессий: Учеб. пособие. 3-е изд., доп. М., 2005.
2. Мирзаянова Л. Ф. Упреждающая адаптация студентов к педагогической деятельности (кризисы, способы упреждения и смягчения) / Под ред. Т. М. Савельевой. Мн., 2003.
3. Поликарпов В. А., Пекарская В. Ю. Установка на получение высшего образования как одна из поведенческих стратегий, ведущих к материальной неудовлетворенности: Сб. науч. ст. / Под науч. ред. А. М. Кухарчук, Л. Ф. Мирзаяновой. Барановичи, 2005. С. 32–38.
4. Пряжников Н. С., Пряжникова Е. Ю. Психология труда и человеческого достоинства: Учеб. пособие для студ. М., 2003.
5. Слободчиков В. И., Исаев Е. И. Основы психологической антропологии. Психология развития человека: Развитие субъективной реальности в онтогенезе: Учеб. пособие для вузов. М., 2000.


## Аб арганізацыі кваліметрычнага кантролю ведаў вучняў профільных класаў


*Я. І. Міронч, БДПУ, г. Мінск*


Дзеля эфектыўнай арганізацыі асобасна з'арыентаванай бесперапыннай адукацыі ў сістэме ўстановы адукацыі БДПУ пры факультэце даўніверсітэцкай падрыхтоўкі арганізаваны і паспяхова функцыянуюць профільныя педагагічныя класы. Распрацаваная сістэма кваліметрычнага кантролю ведаў вучняў педагагічных класаў грунтуецца на параметрах:

а) дыягностыка колькасных і якасных характарыстык у матывацыйнай сістэме і кагнетыўнай сферы асобы;

б) выяўленне ступені эфектыўнасці засваення вучнямі адукацыйных стандартаў у кантэксце інавацыйных элементаў кантролю;



в) рэалізацыя механізма інтэграванага інавацыйнага развіцця адукацыйнай сістэмы БДПУ, якая дазваляе павысіць узровень ведаў патэнцыяльных абітурыентаў.

Тэхналогія кантролю ведаў вучняў уключае ў сябе модулі планавання вучэбнага працэсу і рэалізацыі мэт і задач выкладання вучэбных прадметаў, якія ляжаць у аснове мабільнага вучэбнага плана, састаўленага па фізіка-матэматычным, прыродазнаўчым, грамадска-гістарычным, філалагічным і лінгвістычным педагагічных профілях. Праграмы профільнага навучання дазваляюць вучням аптымальна адаптавацца да больш высокіх патрабаванняў ВНУ і забяспечваюць пераемнасць адукацыі старшакласнікаў як патэнцыяльных абітурыентаў БДПУ.

Кваліметрычны кантроль прадугледжвае аналіз якасці ведаў вучняў не толькі горада, але і сяла. Такі інтэграваны падыход да аналізу ведаў вучняў розных сацыяльных груп дазваляе правесці адэкватны адбор патэнцыяльных абітурыентаў, якія маюць адпаведную схільнасць, навыкі і ўменні дзеля далейшага навучання ў педагагічнай ВНУ.

Разам з гэтым, кваліметрычная тэхналогія дазваляе выявіць цяжкасці ў засваенні асабліва сельскімі вучнямі асобных раздзелаў і тэм вучэбнай праграмы з мэтай вызначэння накірункаў карэкцыі якасці ведаў.

Праектаванне навукова-метадычнага суправаджэння карпаратыўнай дзейнасці школы і БДПУ рэалізуецца ў сістэме метадычных семінараў настаўнікаў педагагічных класаў, на якіх калегіяльна распрацоўваецца перыядызацыя і класіфікацыя відаў вучэбна-метадычнай дзейнасці ад праблематызацыі да экспертызы дыдактычнага матэрыялу па кожнай дысцыпліне ў адпаведнасці з патрабаваннямі школьных праграм і праграм для паступаючых у ВНУ Рэспублікі Беларусь.

Інтэграванасць вучэбнага плана абумоўлена неабходнасцю рэалізацыі прынцыпа дэдукцыі пры дэкампанаванні мэт і задач навучання, якое дазваляе выдзяліць канкрэтныя віды работ, накіраваныя на рашэнне больш вузкіх спецыфічных задач па кожнаму профільнаму прадмету з мэтай карэкцыі якасці ведаў вучняў.

На этапе планавання распрацоўваецца каляндарны план-графік работ па рэалізацыі вучэбных праграм, у якім адлюстроўваюцца даты, віды вучэбнай дзейнасці і кантролю і іх дакладная паслядоўнасць.

Навукова-метадычнае суправаджэнне прадугледжвае распрацоўку вучэбнага раздатачнага матэрыялу дзеля самастойнага выканання вучнямі планавых кантрольных работ і стварэння вучэбна-метадычных дапаможнікаў па кожнай профільнай дысцыпліне.

На дадзены момант на ФДП прайшлі апрабацыю вучэбна-метадычныя дапаможнікі па матэматыцы, біялогіі, рускай мове і беларускай літаратуры. Прайшлі апрабацыю і запланаваны да друку ў бягучым годзе дапаможнікі па фізіцы, геаграфіі, хіміі, гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі навейшага часу, англійскай і нямецкай мовах. Дапаможнік «Педагогіка для пачынаючых» паспрыяе вучням профільных класаў у самавызначэнні пры канчатковым выбары сваёй будучай прафесіі.